
25 ЖНІЎНЯ 1999г. СЕРАДА

НАВІНЫ

№96 (627) КОШТ СВАБОДНЫ


стар.3

БЕЛОРУССКИЕ РЕБУСЫ

ПОШТА 

Вместе нам хватит 20 минут

Даже у птиц есть сбор во время беды. Они собираются вместе для самозащиты в час опасности. Они на своем птичьем языке взывают к самоотверженности ради общей победы. Но мы белорусы — хуже птиц, мы редко собираемся вместе. Молчим, сидим по квартирам, скучаем, пьем вино или говорим пустое, и в голову нам не приходит: а ведь в нашей стране похищают людей, сажают в тюрьму! Там ведь этих людей мучают, и ни одному белорусу до этого нет дела. Похищен Захаренко. Минск молчит. Народ молчит. Похищен, ну и похищен, что нам от этого, не нас же похитили, не нас избивают. Сидит Чигирь, неизвестно за что сидит — тоже не важно. Миллионам белорусов наплевать на то, что творит Лукашенко.

На первый раз хватило бы всего на 20 минут остановить заводы всего Минска, чтобы потребовать ответа у президента: что же ты делаешь, человек? На первый раз достаточно 20 минут. Но нам времени жалко. Никому ничего не надо — лишь бы меня не трогали. У вас свое, у меня мое: поел и в хлев, молчу, соплю. Не принято в этой стране спасать, беспокоиться за других, потому что трусости много у каждого, мягкотелости, безразличия.

С такими качествами погибнем мы как народ. Стыдно, что миллионы белорусов такие трусы, невыносимо от того, что миллионы боятся спросить у одного «хозяина», где же Захаренко, Винникова, почему сидит Чигирь? Давно пора, но нет — одно зловещее трусливое молчание.

Так нельзя жить, нужно заставить себя уважать, а не быть зажатым скотом. Они не считают нас людьми, вот и похищают, и сажают, не боясь возмущения миллионов. Похитили тех, посадили других, но могут придти за каждым. За трусами и молчунами не приходят пока, но приходят за честными, смелыми и справедливыми. А трусы и молчуны помогают всякому беззаконию, и этим поддерживают террор и репрессии.

Чтобы отучить Лукашенко от практики похищать и сажать невинных людей, нужно уважать свое человеческое достоинство. Люди, как птицы, должны собираться и требовать не за себя, а за своих земляков, требовать свободы. На первый взгляд посмотришь, и кажется: глупые птицы — кружат, галдят... Нет, не глупые птицы, это глупые люди, которые не беспокоятся о своих мучениках и просто людях. Грош нам будет цена, будем мы пропащий, никчемный народ, если не сможем отдать хотя бы двадцать минут на защиту правды.

Виктор ГРОМОВ, Витебская область

«Охотник» со шприцем

Что же все-таки произошло в «Мечте» и других детских лагерях Минской области? Кто тот неизвестный, совершивший странное преступление в детской спальне? Неужели подобные случаи происходили на протяжении уже нескольких лет? Почему тогда этим серьезно заинтересовались только сейчас?

Ростислав ПЕРМЯКОВ

Раскрытием необычного преступления занят следственный отдел Воложинской милиции. Подобного случая в практике местных следователей еще не было. Непонятны мотивы, которые подвигли человека на такое необычное преступление. Неизвестный мужчина пробрался в детский оздоровительный лагерь «Мечта» и ввел наркотический препарат Алене Ю. Об этом факте НАВІНЫ писали в прошлом номере. Сейчас нам стали известны новые подробности дела.

Итак, все произошло в ночь с четверга на пятницу. Как сообщили нам свидетели в лагере, в эту ночь над «Мечтой» бушевала гроза.

Поздним вечером директор лагеря сам сделал обход всего корпуса, чтобы убедиться, закрыты ли все окна и двери. Дело в том, что, в отличие от большинства детских лагерей, в «Мечте» все дети размещаются в одном каменном трехэтажном корпусе. В эту смену в лагерь приехало 111 детей в возрасте от 6 до 16 лет. Всех их разбили на 4 отряда – по возрастным группам.

Персонал лагеря считает, что неизвестный мог пробраться в здание, либо открыв дверь своим ключом, либо через окно на первом этаже. Во всяком случае, он проник на территорию лагеря со стороны черного хода. Это произошло не раньше двух и не позже трех часов ночи.

Неизвестный поднялся на второй этаж. Там он почти сразу направился в предпоследнюю палату №25. В этой палате, рассчитанной на четыре человека, он выбрал Алену Ю. Алена перешла в пятый класс, но выглядит уже достаточно развитым подростком. Преступник предложил ей «перевернуться на живот, чтобы сделать укол от дифтерии». Алена послушалась, и укол был сделан. Почти сразу после этого девочка почувствовала себя плохо, у нее закружилась голова. Она решила сходить к воспитателям, но сразу не смогла этого сделать, так как преступник не уходил.

Тем не менее, вскоре она была уже в соседней палате, где ночевали воспитатели. Воспитатели сначала не поверили рассказу Алены – решили, что ей все приснилось. Но чтобы успокоить девочку, положили ее спать в своей палате. Алена заснула и начала странно храпеть. Ее попытались разбудить – безуспешно. Тогда 21-летняя Виктория Толяронок поняла, что что-то не так, и решила разбудить директора. Его спальня размещается на том же этаже. По дороге молодая воспитательница заметила какого-то человека, стоящего неподалеку, но не стала подходить к нему.

Спросонья директор не сразу понял, что случилось. А разобравшись, принялся действовать. Пока он одевался, Виктория Толяронок включила свет и заметила, как неизвестный стал спускаться по лестнице. Воспитательница окликнула его, но преступник ничего не ответил – только внимательно посмотрел на нее.


Фото Ул. ШЛАПАКА

Именно на этой кровати спала в ту ночь **Алена Ю**. Девушка на фотографии – воспитательница, которая видела преступника. Из соображений ее безопасности мы частично скрыли ее лицо



Парадный вход в «Мечту»



Преступник, скорее всего, выбрал эту дорогу через черный ход, чтобы попасть в здание лагеря.

«У него были тупые глаза, — вспоминает Виктория, — он выглядел совсем обычным человеком, но у него были такие тупые глаза. Мне стало страшно». По описанию воспитательницы, это был плотный человек 30-35 лет, ростом 175-180 см., в зеленой футболке навыпуск с длинными рукавами и темных штанах. Прическа у него была «ежиком», волосы темного цвета, небольшая лысина.

Директор лагеря решил начать поиск злоумышленника с подвала, но никого там не обнаружил. Преступник успел скрыться. Надо полагать, он хорошо знал расположение помещений в здании. Возможно, он раньше уже здесь бывал под видом родителя.

Сотрудники лагеря звонили в милицию и «скорую помощь». «Скорая» приехала достаточно оперативно, а вот милицию пришлось подождать – по свидетельству сотрудников, они ехали часа полтора.

Алену Ю. отвезли в реанимацию 3-ей детской клинической больницы в Минске. Там ей было сделано промывание, у нее взяли анализ крови, чтобы проверить – что же ей такое укололи. Сейчас девочка уже почти поправилась, но пока остается в больнице.

Начальник Воложинского РОВД Валентин Лаппо заявил, что надеется в течение 10 дней найти маньяка. По его словам, за 23 года работы в милиции подобного случая в его практике еще не было.

Непонятны мотивы, которые подвигли человека на такое необычное преступление. Пока что по факту было возбуждено уголовное дело по статье 201 ч.2 – «злостное хулиганство». ▶

Окончание на стр.2

ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ


Вобыск у штаб-кватэры АГП

Каля 12 гадзінаў дня ў аўторак у штаб-кватэру Грамадзянскага форуму, дзе часова размяшчаецца і офіс АГП, уварваліся без прад'яўлення ордэра на вобыск пяцёра чалавек. Адзін з іх участковы Кастрычніцкі і чацвёра ў цывільным, а таксама аператар з відэакамерай. Яны заявілі, што Грамадзянскі форум не мае права займаць гэтае памяшканне згодна з жыллёвым кодэксам, які ўступіў у дзеянне 1 ліпеня. Міліцыянты ўчыніліператрус у памяшканні, сканфіскаваўшы пры гэтым экземпляры «Беларускай деловой газеты», «Народнага прэзідэнта», а таксама старыя ўлёткі, якія заклікалі прыйсці на Кастрычніцкую плошчу 21 ліпеня. Была таксама спроба канфіскаваць вінчэсцер з камп'ютэра, але старшыня Грамадзянскага форуму Уладзімір Навасяд, які ў гэты час знаходзіўся ў памяшканні, здолеў абараніць вінчэсцер ад міліцыянтаў, проста схаваўшы яго. У гэты ж час пры ўваходзе ў памяшканне знаходзіліся двое ўзброеных аўтаматамі і бронекамізэлькамі міліцыянтаў. Былі складзеныя пратаколы канфіскацыі «забароненай» літаратуры, якая была дастаўленая ў мясцовы ГАМ. Варта дадаць, што панятыя пратаколы падпісаць адмовіліся.

Аляксей ШЫДЛОЎСКІ

наша свабода

НАДВОР'Е



25 жніўня па рэспубліцы чакаецца пераменная воблачнасць, па ўсходзе кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы, вецер паўночна-заходні, 4–9 м/сек. **26–27 жніўня** чакаецца невялікая воблачнасць, без ападкаў, вецер няўстойлівы, слабы. Тэмпература паветра ўначы 3–8, на тарфяніках Палесся месцамі слабыя замаразкі да 0 — -1 градус. Удзень — 18–23, 27 жніўня па паўднёвым захадзе – да 25.

Курс наяўнага долара на «чорным рынку»

490 000

СЕРАДА з Аляксандрам ДУБРАВІНЫМ



Давайце дружна...

У нас з вамі, шаноўныя чытачы, многа прэтэнзіяў да лідэраў апазіцыйных дэмакратычных партыяў, да дэпутатаў Вярхоўнага Савета 13 склікання, да спікера парламента Шарэцкага. Многа хібаў мы можам прыпомніць. Многа памылак зрабілі яны ў свой час. Але чаму мы да гэтага часу займаемся крытыкай. «Апазіцыя не арганізаваная». «У апазіцыі няма лідэраў», «Апазіцыя слабая» — чуем мы ўвесь час вакол. Афіцыйная прэса з задавальненнем падтрымлівае такія высновы і зларадна каментуе іх.

Дэмакратычная апазіцыя ўвогуле не можа быць адназначнай і аднастайнай, бо яна складаецца з незалежных у сваіх дзеяннях і думках асобаў, якія не саромеюцца і не баяцца адстойваць сваю грамадзянскую пазіцыю. А лідэры ёсць, толькі ім пакуль забаронены выступленні на тэлебачанні.

Апазіцыя, як сведчаць прыклады з гісторыі нашай краіны, у нас нармальная, не горшая за іншых.

А вось якія мы з вамі? На вуліцы Бялграда сёння выходзяць сотні тысяч сербаў з патрабаваннем адстаўкі прэзідэнта Мілошавіча. Якое ўзрушэнне патрэбнае беларусам, каб на вуліцы Мінска выйшлі сто тысяч чалавек? А якая касмічная катастрофа павінна здарыцца, каб усе, хто супраць дыктатуры ў думках, выступілі адкрыта?

Між тым, усё магчыма.

Як гэта зрабіць? Вядома, законна. Трэба ўсім нам, хоць раз, але ўсім, выйсці на вуліцы Мінска ў час дазволенага ўладамі мітынгу. Дзесяткі тысяч, сотні тысяч чыстых светлых твараў пад бел-чырвона-белымі нацыянальнымі сцягамі — відовішча каласальнае. Давайце выйдзем з патрабаваннямі перадачы ўлады законнаму парламенту. Давайце маральна падтрымаем нашу апазіцыю. Давайце запатрабуем вызваліць палітычных вязняў, зрабіць суд незалежным, а закон — абавязковым для ўсіх. Давайце напомнім усім, што Беларусь вольная, незалежная краіна.

Гэтая акцыя павінна быць як імклівы народны рэферэндум за лепшае будучае.

А што гэта дасць? Кожнае дзеянне мае свой вынік. Арганізаваны пратэст соцень тысяч грамадзянаў прымусіць Лукашэнку сесці за стол перамоваў з дэмакратычнай апазіцыяй. З гісторыі вядома, што перамовы ён пачынаў толькі пад уплывам шырокага народнага пратэсту. Іншага выхаду, на жаль, у нас не засталося. Мы вымушаны патрабаваць ад рэжыму паважаць нас.

Нас многа. Давайце разам...

«Охотник» со шприцем

Окончание. Начало на стр.1

Валентин Лаппо считает, что охрана корпуса «Мечты» была организована не лучшим образом. Однако, что может противопоставить преступнику обычный сторож? Если в Минской области это был не первый случай, то почему областная милиция не усилила охрану детских лагерей?

Начальник Воложинской милиции говорит, что на территории его района находится 31 детский оздоровительный лагерь, некоторые работают круглогодично. Однако, по его мнению, нельзя поставить по милиционеру к каждому корпусу, где спят дети (в некоторых лагерях этих корпусов – больше десяти), нельзя выводить детей под милицейским контролем в лес и на речку: «Это уже получится специнтернат для малолетних преступников, а не детский лагерь».

С другой стороны, министерство внутренних дел вполне могло выделить из 130-тысячной армии милиционеров хотя бы несколько сотен человек на охрану мест, где отдыхают дети. Тем более, что, по неофициальной информации, этим летом уже было около 5 подобных случаев – в районе Узды, Молодечно и некоторых других. Были похожие случаи и в прошлые годы. «Странность» даже первого случая должна была насторожить компетентные органы.

Существует несколько версий, чем руководствовался этот человек, делая укол девочке, – от простого желания привлечь к себе внимание (этого он уже добился в полной мере) до преднамеренного заражения детей СПИДом (мы очень надеемся, что это не так). Во всяком случае, ясно, что с психикой у человека не все в порядке. И если у милиции не получится оперативно поймать преступника, то неизвестно, какой еще финт выкинет его психика и чего вообще от него можно еще ждать. Так что остается только пожелать милиции скорейшей поимки маньяка. ■

З Польшчы дэпартавалі 25 беларусаў

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

У ноч з 22 на 23 жніўня польскія ўлады дэпартавалі з тэрыторыі сваёй краіны 25 грамадзянаў Беларусі, затрыманых у пятніцу ў Варшаве за парушэнне правілаў знаходжання іншаземцаў у Польшчы. З гэтай нагоды амбасадар Беларусі ў Варшаве Віктар Бурскі ўжо выказаў афіцыйны пратэст польскаму міністэрству замежных справаў.

20 жніўня варшаўская паліцыя правяла рэйд па пошуку іншаземцаў-нелегалаў на адным з рэчавых рынкаў польскай сталіцы. У выніку акцыі паліцыянты затрымалі каля 300 гандляроў — выхадцаў з краінаў Паўднёва-Усходняй Азіі, Афрыкі і СНД. Сярод затрыманых аказаліся і 25 грамадзянаў нашай краіны.

Прадстаўнікі галоўнага паліцэйскага камісарыята Варшавы сцвярджаюць, што беларускія гандляры не мелі пры сабе дастатковай колькасці грошай, неабходных для знаходжання на тэрыторыі Польшчы, а рэальная дзейнасць беларусаў супярэчыла афіцыйна задэкляраванай мэце прыезду ў сталіцу суседняй краіны. Беларускія грамадзяне прыехалі ў Польшчу па турыстычных ваўчарах і, згодна з польскім заканадаўствам, не мелі права займацца гандлем.

Паліцыянты змясцілі нашых суайчыннікаў разам з іншымі нелегаламі ў спецыяльны лагер пад Варшавай, створаны на базе адной з расфармаваных вайсковых частак, і праз два дні дэпартавалі з тэрыторыі Польшчы. Прычым імёны і прозвішчы гэтых 25 беларусаў паляк і ўнеслі ў спецыяльны чорны спіс, і на працягу года ўезд у Польшчу для іх будзе забаронены.

А тым часам беларуская амбасада ў Польшчы выказала ўладам гэтай краіны афіцыйны пратэст, бо, на думку беларускіх дыпламатаў, польскі бок парушыў у адносінах да грамадзянаў Беларусі некалькі пунктаў Венскай канвенцыі. Цяпер паміж консульскім аддзелам амбасады Беларусі ў Варшаве і польскім МЗС адбываюцца кансультацыі адносна ўрэгулявання гэтага канфлікту. Пакуль цяжка сказаць, ці мелі рацыю польскія паліцыянты, ужываючы супраць нашых суайчыннікаў такі радыкальны сродак, як дэпартацыя. Бо, з аднаго боку, у Польшчы ёсць свае законы, якія паліцыя павінна выконваць, але, з другога — вядаць, не ад добрага жыцця беларусы едуць у суседнюю краіну, каб хоць неяк зарабіць трохі валюты для сваіх сем'яў.

Дарэчы, польскі МЗС таксама пакуль не выпрацаваў адназначнай пазіцыі адносна гэтага інцыдэнту. Як паведаміў НАВІНАМ прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства Польшчы Павел Дабравольскі, рашэнне аб дэпартацыі прымаў паліцэйскі камісарыят Варшавы. Паводле словаў сп.Дабравольскага, польскі МЗС абавязкова высветліць у прадстаўнікоў паліцэйскага ўпраўлення, наколькі законна дзейнічалі ў адносінах да беларусаў ахоўнікі парадку, і дасць афіцыйны адказ дыпламатычнаму прадстаўніцтву Беларусі ў Варшаве. ■

ФОТАФАКТ



Василий Шлындиков, заместитель председателя Объединенной гражданской партии, на пикете, проводимом объединенными демократическими силами

СУДОВЫ ПРАЦЭС

Ці стане гаварыць экс-міністр?

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

У Мінску аднавіўся працэс над былым міністрам сельскай гаспадаркі Васілём Лявонавым.

Ужо ў самым пачатку ўчарашняга паседжання суддзям прыйшлося разбірацца, чаму падсудзімага Лявонава падчас працэсу не кормяць абедам. Аказваецца, існуе інструкцыя міністэрства ўнутраных справаў, згодна з якой на працягу 10 дзён ад пачатку суда падсудзімага не забяспечваюць абедам, калі ён застаецца ў судзе да вечара. Адпаведна пазбаўляецца арыштант і прагулкі на свежым паветры — маўляў, для гэтага няма ўмоваў. Адвакаты Лявонава лічаць такія абмежаванні незаконнымі. Прадстаўнік Хельсінкскага камітэта грамадскі абаронца Барыс Звозскаў увогуле параўнаў падобную практыку з катаваннем і прапанаваў суду зрабіць вызначэнне ў адрас міністэрства ўнутраных справаў. Суд параіўся і хадайніцтва адхіліў. Заяўлена, што разбірацца ў законнасці інструкцыяў МУС — не ягоная кампетэнцыя, і ўвогуле гэтая праблема не мае дачынення да справы.

Увесь дзень суд зачытваў матэрыялы абвінавачага заключэння. Яны тычацца дзейнасці Васіля Лявонава на пасадзе міністра сельскай гаспадаркі. У прыватнасці, следства сцвярджае, што экс-міністр скарыстаўся сваім службовым становішчам, каб пралабіраваць камерцыйныя інтарэсы фірмы «Руст-інвест» і тым самым адхзячыць за тое, што работнікі гэтай фірмы, як сцвярджае следства, бясплатна пабудавалі Лявонаву катэдж. Таксама былі агалошаныя абвінавачванні ў махлярстве з нафтапрадуктамі аб'яднання «Нафтан» і атрыманні мэблі ў якасці хабару ад акцыянернага таварыства «Рассвет». На працэсе неадназначна паўтараецца, што Лявонаў сябе вінаватым у прад'яўленых яму злачынствах не прызнаў і на следстве адмаўляўся ад дачы паказанняў па гэтых эпізодах. Ці загаворыць экс-міністр у судзе, стане вядома праз некалькі дзён, калі пачнуцца допыты. ■

ЦЫТАТА НУМАРА

И еще. Западу пора понять, что интересы подавляющего большинства в нашей стране представляет и выражает Президент.

Андрей КОЗЛОВИЧ
«Советская Белоруссия», 24 августа 1999г.

Заслугі перад Богам банкіру не дапамаглі

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Заўтра працягнецца судовы працэс над былым старшынём праўлення Ашчаднага банка Уладзімірам Хількам. Нягледзячы на паручыцельства ад Мінскай епархіі, Беларускага Хельсінкскага камітэта і міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогіяў, суд адхіліў хадайніцтва адваката аб змяненні меры стрымання для У.Хількі. Як распавяла яго жонка, Зінаіда Хількo, яе муж узнагароджаны ордэнам Святога Уладзіміра III-й ступені. Такім чынам Маскоўскі патрыярх Алексій II адзначыў «царкоўныя заслугі» банкіра, які, апроч іншага, рабіў ахвяраванні для Жыровіцкага манастыра. Савецкі суд не прыняў да ўвагі паручыцельства Мінскай епархіі, якая прасіла вызваліць дабрачынніка У.Хількі з-пад варты. Цяжка хворы банкір з'яўляецца на судовыя паседжанні ў прысутнасці турэмнага ўрача-рэаніматара і медыцынскай сястры. Да яго падключаныя апараты, якія рэгіструюць ціск і стан сардэчнай дзейнасці. ■

Сясцёр Юліі Чыгір выклікаюць на допыт

Рыгор БУЯН

У справе былога прэм'ер-міністра ніякіх зрухаў дагэтуль няма. Акрамя таго, што сястру ягонай жонкі Юліі Чыгір Зою, якая жыве ў Нясвіжы, выклікаюць на допыт у следчы камітэт міністэрства ўнутраных справаў. Самае цікавае ў тым, што позву прыйшлі ўручаць ажно два «таварышы». Зоя павінна сёння, 25 жніўня, быць на вуліцы Рэвалюцыйнай, 3, дзе знаходзіцца следчы камітэт. У графе, у якасці каго хочуць дапытаць сястру жонкі Чыгіра, указваецца: па справе. Па якой – следчыя не палічылі патрэбным удакладніць, але няцяжка здагадацца, што выклікаюць Зою па «справе Чыгіра», якую якраз і расследуе камітэт.

«Якое дачыненне мае мая сястра да выдадзеных Чыгіром крэдытаў — не ведаю», — так пракаментавала Юлія Чыгір гэты факт. Што да другой сястры жонкі Чыгіра — Наталлі, якая жыве ў Стоўбцах, то яе пакуль не чапаюць. Можа таму, што ўсе выхадныя і ў панядзелак Наталлі папросту не было дома. ■

Страйкі становяцца больш частымі

Аляксей ШЫДЛОЎСКІ

Па інфармацыі, якая паступіла ў НАВІНЫ з штаба Свабоднага прафсаюза Беларускага, за апошнія двое сутак два страйкі былі распачатыя адпаведна ў Мінску і ў Бабруйску.

У сталіцы Беларусі 100 рабочых ААТ «Мінскі завод радыятарнага абсталявання» не прыступілі ўчора да працы. Прычына трывіяльная — няпоўнасцю выплачаны заробак за ліпень.

Але калі ў Мінску працоўныя баставалі не выходзячы з цэха, то на Бабруйскім заводзе транспартных дэталяў і агрэгатаў іхнія калегі дружна выйшлі за прахадную, паграджаючы прыступіць да працы толькі пасля выплаты грашовай запазычанасці за два з паловай месяцы. І ў Мінску, і ў Бабруйску забастоўшчыкі гатовыя былі адстойваць свае правы да пераможнага канца. НАВІНЫ будуць адсочваць сітуацыю на прадпрыемствах і надалей. ■

РНЕ ў цэнтры Гродна

Сяргей МАКСІМОВІЧ

Цэнтральная плошча Гродна — Савецкая — за ноч аказалася спісанай вялізнымі літарамі РНЕ. Непадалёк на сцяне рэдакцыі газеты «Біржа інфармацыі» з'явілася чорная руская свастыка. Шыльду газеты невядомыя знішчылі, а на яе месцы напісалі сваю абрэвіятуру. У паштовую скрыню рэдакцыі былі ўкінутыя дзве фашысцкія ўлёткі са свастыкай і надпісамі: «РНЕ. Мы здесь — обратной дороги нет!» і «Русской земле — русский порядок». Крыху раней увесь цэнтр горада быў заклеены газеткай «Русского Национального Единства». Ні ўлады, ні міліцыя ніяк не рэагуюць на здарэнне. Надпісы нават не зачыраюць. ■

«Спартак» заплаціць за балельшчыкаў

Мікола ВАЙТОВІЧ

Пяцёра расійскіх балельшчыкаў, затрыманых на мінскім стадыёне «Дынама» падчас таварыскага матча паміж нацыянальнымі зборнымі Беларусі і Расіі, чакаюць судовага працэсу. Супраць іх узбуджаныя крымінальныя справы за злоснае хуліганства.

Як нам паведамілі ў прэсслужбе гарадскога ўпраўлення ўнутраных справаў, астатнія заўзятары з Расіі ўжо атрымалі адміністратыўныя пакаранні. Дзесяць сутак адміністратыўнага арышту адседзелі ў Мінску два балельшчыкі, астатнія 19 былі арыштаваныя на тэрмін да 5 сутак. Некаторых аштрафавалі ад 500 тысяч да мільёна беларускіх рублёў, астатнія абыйшліся заўвагамі ці папярэджаннямі. За чатыры крэслы, якія балельшчыкі з Расіі зламалі падчас матча, узяўся заплаціць маскоўскі клуб «Спартак». ■

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Белорусские ребусы для Леонида Кучмы

Встреча президентов Украины и Беларуси, дата которой неоднократно переносилась, все же состоится

Роман ЯКОВЛЕВСКИЙ

После телефонного разговора, который состоялся у Леонида Кучмы с Александром Лукашенко почти месяц тому назад, белорусская сторона сделала ряд заявлений о том, что оба президента договорились встретиться в ближайшее время. При этом отмечалось, что встреча пройдет на территории Беларуси, в Беловежской пуще, под Брестом. В то же время в украинском посольстве в Минске сообщили, что Леонид Кучма предложил белорусскому президенту изменить условия встречи и пригласил Лукашенко прибыть в Крым, где до 15 августа Кучма проводил отпуск. Однако, как выяснилось, туда А.Лукашенко собирается в сентябре. И совсем по другому поводу.

10-11 сентября в Ялте должен состояться саммит, в котором, как обещают его организаторы — президент Украины и его администрация, будут представлены около 20 стран Балто-Черноморского региона. Среди них фигурирует и Беларусь. По информации, полученной из компетентного источника в Киеве, ряд стран, приглашенных в Ялту, выступили против участия в балточерноморской встрече руководителя Беларуси. По их мнению, проводимая Минском как внутренняя, так и внешняя политика еще весьма далека от общепринятых европейских стандартов. Особо неприятным для официального Минска стало то, что среди «недоброжелателей» оказалась Норвегия, которая председательствует в ОБСЕ, и президент соседней Польши.

Очевидно, что позиция Александра Квасьневского в отношении своего тезки и ровесника за Бугом диктуется и внутриполитическими причинами. В начале следующего года в Польше состоятся президентские выборы, в которых А.Квасьневский примет участие. В польском обществе в отношении Беларуси существует консенсус, так что какую-то особую позицию в отношении нынешнего руководителя Беларуси президент Польши занимать не намерен.

Как известно, переизбраться на пост президента намерен и Л.Кучма. Выборы в Украине должны состоятся в октябре. Предвыборная кампания набирает обороты. Не секрет, что Л.Кучма рассматривает предстоящую ялтинскую встречу как демонстрацию поддержки европейцами проводимой им политики. Игнорировать их критическое отношение к нынешнему руководству Беларуси Л.Кучме затруднительно. В то же время он не может не учитывать популярности А.Лукашенко среди населения Восточной Украины. Именно ее электорат сделал Л.Кучму президентом страны. Говорят, чтобы избежать скандала, Л.Кучма предлагал А.Лукашенко под каким-нибудь предлогом самому отказаться от поездки в Ялту, что было расценено Минском как недружественный жест со стороны Киева.

Оказавшись перед поставленными перед ним ребусами, Л.Кучма был вынужден уступить и согласиться приехать в Беловежскую пущу, где ориентировочно 3-4 сентября должна пройти встреча двух президентов. Одним из пунктов встречи будет вопрос о саммите в Ялте. Правда, саммитом его уже вряд ли можно будет назвать. По предварительной информации, предполагается, что Германию на ней будет представлять вице-канцлер, министр иностранных дел Йошка Фишер. Не первыми лицами будут представлены и некоторые другие страны — участнице встречи, в том числе и России.



● «Против кого дружить будем, Леня?»

По полученной от весьма компетентного источника, близкого к администрации президента Л.Кучмы, причиной изменения уровня ялтинской встречи является не только возможное появление на ней президента А.Лукашенко. Серьезную критику со стороны европейских государств вызвала политика Л.Кучмы по поводу закрытия независимых СМИ на Украине. Поэтому ожидавшаяся в Ялте демонстрация поддержки европейцами будет не так однозначна. А что касается руководителя Беларуси, то он оставил для себя поле для маневра: захочу поеду, а может, и нет. Ведь там будут не только президенты. Но, настояв на приезде Л.Кучмы в пущу, А.Лукашенко продемонстрировал свое значение и для славянской Украины. Это не последний белорусский ребус, который Л.Кучме придется решать. ■

Использован информационный ресурс www.open.by

СТРАШЭННЫЯ ЛІЧБЫ

Нацыянальны крытэрый

Дадзеныя перапісу насельніцтва, які адбыўся напачатку бягучага года, яшчэ не апублікаваныя, але ў значнай ступені яны ўжо састарэлі

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

Прынамсі таму, што за 6 месяцаў у краіне памерла болей за 76 тысяч чалавек, нарадзілася меней як 47 тысяч, так што колькасць «тутэйшага» люду зменшылася амаль на 30 тысяч. У параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года смяротнасць на 1.000 чалавек узрасла з 13,6 да 15,1 выпадку, а нараджальнасць амаль не павялічылася: было на 1.000 чалавек 9,1 народжаных, стала — 9,2.

А разам колькасць памерлых за апошнія паўтара года склала 213,6 тысячы, што на 73,9 тысячы болей за колькасць народжаных. Больш за ўсё людзі мруць ад хваробаў: захворванні сістэмы кровазвароту забралі больш паловы ахвяраў, яшчэ 13 працэнтаў памерлі ад новаўтварэнняў, значная колькасць — ад захворванняў органаў дыхання, страўвання, інфекцыйных і паразітарных хваробаў. Дарэчы, статыстыка зарэгістравала значны рост смяротнасці ад інфекцыйных і паразітарных захворванняў (амаль 140 працэнтаў), органаў дыхання (121,3 працэнта), кровазвароту (114,5 працэнта). Няшчасныя выпадкі, атручванні і траўмы забралі жыццё ў 8,5 тысяч чалавек. Сярод іх кожны дзесяты выпадкова ўтапіўся, прыблізна такая ж колькасць загінула на дарогах, кожны пяты скончыў жыццё самагубствам, а 548 чалавек сталі ахвярамі забойстваў. На 100.000 насельніцтва прыйшліся 24 чалавекі, якія загінулі ад выпадковых атручванняў алкаголем. Многа гэта ці не? Можа не многа, але калі ўявіць сабе горад з насельніцтвам у 100.000, прыкладам Оршу, то атрымаецца, што ў ім кожны тыдзень нейкага небараку сустракае п'яная смерць.

Зразумела, што людзі паміраюць усюды. Але ў краінах з высокай смяротнасцю яна звычайна кампенсуецца яшчэ больш высокай нараджальнасцю. Прычым, калі рост насельніцтва абганяе эканамічны рост, гэта лічыцца крытэрыем недаразвітасці. Практычна ва ўсіх цывілізаваных краінах сёння насельніцтва скарачаецца, але ў іх людзі ўмеюць працаваць, што забяспечвае эканамічны рост і падвышае дабрабыт усіх сацыяльных слаёў. Знешне падобна да нашай сітуацыі, бо статыстыка дэкларуе зайздросны эканамічны рост, але пры гэтым мы з кожным днём беднеем. Хто яго ведае: лічыць гэта беларускім крытэрыем недаразвітасці ці, наадварот, імклівага развіцця?

Але зразумела адно. Насельніцтва не так верыць статыстыцы, як уласнаму жыццёваму вопыту. Таму развітыя краіны, як і раней, цягнуць да сябе многіх, бы той магніт. Прычым пакінуць «радзіму росту валавага прадукту» хацелі б многія, а пакідаюць тыя, хто на гэта здольны. Звычайна самыя-самыя: хітрыя, энергічныя, адукаваныя, умелыя, самалюбівыя. Прага да заходніх свабодаў настолькі вялікая, што многія гадамі рыхтуюцца да ад'езду, а з улікам таго, што гэта людзі ў асноўным маладыя, амаль усё разумнае жыццё. Вось і ў гэтым годзе ў далёкі зарубеж, як і год таму, выехалі 2,5 тысячы чалавек.

Да нас жа на жыхарства імкнуцца ў асноўным з Расіі, Украіны і Казахстана. Можа таму, што іх прываблівае створаны СМІ імідж квітнеючай Беларусі, а хутчэй за ўсё ад няўтульнасці жыцця ў гэтых краінах, былых рэспубліках, на адбудову якіх так ахвотна пры савецкім часе ехалі беларусы. Цяпер вяртаюцца дажывацць? ■

ПОСТФАКТУМ

Политики азиопского масштаба

Валентина ТАРАН

Удивительное дело — трех лет не прошло, а такое впечатление, что референдум-96 был так давно, что уже, как будто, и не вспомнить ни народу, ни его слугам, ни обслуживающему их персоналу — о чем же там все-таки шла речь. Вот и пресс-секретарь посольства Беларуси в России Владимир Гулевич на страницах газеты «Труд» (№139), отвечая любознательным читателям из соседней Белгородчины, озабоченным проблемой легитимности Александра Лукашенко после 20 июля, дает свою интерпретацию судьбоносному событию: «24 ноября 1996 года в Беларуси прошел референдум, на котором была принята новая редакция Конституции страны. В числе других, на нем рассматривался вопрос о переносе президентских выборов на 2001 год, или фактически о продлении полномочий Александра Лукашенко еще на два года. За перенос проголосовало подавляющее большинство граждан, принявших участие в референдуме».

Давайте напряжем память: а был ли в действительности в бюллетенях, которые мы черкали той ненастной осенью, вопрос про 2001 год, который привидился уважаемому пресс-секретарю в его московском далёко. Про отношение к смертной казни — было; про бюджетное финансирование власти — спрашивали; хотим ли мы избирать себе местных начальников или пусть их и дальше сверху назначают — интересовались... А вот об удлинении срока и переносе президентских выборов, простите, — не было. И в предложенном президентской стороной на голосование проекте Конституции, про это тоже ни гу-гу. Был там пункт о том, что срок полномочий президента — 5 лет. Вот и вся правовая база «продления полномочий». Хлипкая база, невпечатляющая. Поэтому и приходится ныне придумывать, в меру способностей, для внешнего потребления «пристойные» объяснения пребывания на высоком посту без перевыборов.

А ведь тогда, в 96-ом, отцы конституционной реформы вполне могли бы вынести на голосование отдельным вопросом проблему продления президентских полномочий А.Лукашенко хоть еще на 50 лет и получили бы искомый ответ. Так, как это было сделано и по всем другим вопросам референдума. Ведь выяснилось, что мы не хотим, чтобы власть зависела от наших налогов — пусть ищет себе иные источники пропитания; мы также против выборов градоначальников — сверху видней, кому асфальтированием улиц и мусорными баками заниматься; и мы, конечно же, за смертную казнь — отныне, присно, и во веки веков...

БЮЛЕТЭНЬ

для галасавання на рэспубліканскім рэферэндуме ў Рэспубліцы Беларусь 24 лістапада 1996 года

Пры галасаванні адно з слоў «За» ці «Супраць» па кожнаму пытанню, якое вынесена на рэферэндум, выкрэсліваецца

ПЫТАННІ, ЯКІЯ ІНІЦЫІРАВАНЫ ПРЭЗІДЭНТАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

. Перанесці Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень рэспублікі) на 3 ліпеня — дзень вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў у Вялікай Айчыннай вайне.

За ці Супраць

. Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 года са зменамі і дапаўненнямі (новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь), прапанаванымі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка.

За ці Супраць

. Ці выступаеце Вы за свабодную, без абмежаванняў, куплю і продаж зямлі?

За ці Супраць

. Ці падтрымліваеце Вы адмену смяротнай кары ў Рэспубліцы Беларусь?

За ці Супраць

ПЫТАННІ, ЯКІЯ ІНІЦЫІРАВАНЫ ДЭПУТАТАМІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

5. Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 года са зменамі і дапаўненнямі, прапанаванымі дэпутатамі фракцый камуністаў і аграрыяў.

За ці Супраць

6. Ці выступаеце Вы за тое, каб кіраўнікі мясцовых органаў выканаўчай улады выбіраліся непасрэдна жыхарамі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі?

За ці Супраць

7. Ці згодны Вы, што фінансаванне ўсіх галін улады павінна ажыццяўляцца галосна і толькі з дзяржаўнага бюджэту?

За ці Супраць

Калі пры галасаванні па кожнаму пытанню, якое вынесена на рэферэндум, не выкрэслена ні адно з двух слоў — «За» ці «Супраць» — або выкрэслены два гэтыя словы, бюлетэнь у частцы дадзенага пытання прызнаецца несапраўдным.

Калі пры галасаванні па другому пытанню, якое вынесена на рэферэндум Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, і па пятаму пытанню, якое вынесена на рэферэндум дэпутатамі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, адначасова ў бюлетэні выкрэслена слова «Супраць», бюлетэнь у частцы гэтых двух пытанняў прызнаецца несапраўдным.

Заключэннем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 4 лістапада 1996 года № З-48/96 прызнаны не адпавядаючым Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь пункт 3 пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 6 верасня 1996 года «Аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндума Рэспублікі Беларусь і мерах па яго забеспячэнню» у частцы вынясення праектаў змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі на абавязковы рэферэндум.

Отчего-то о продлении президентских полномочий впрямую спросить постеснялись. Не хотелось следовать примеру коллег из среднеазиатских республик? Зря — они-то себя сегодня неплохо чувствуют, не комплексуют. Очень хотелось выглядеть по-европейски? Наверное, да. Ведь у нас, в Минске, в качестве комплимента, даже китайского лидера называли политиком европейского масштаба...

Как бы там ни было, а получилось ни по-европейски, ни по-азиатски, а как-то по-нашенски — по-азиопски. Чем и гордимся. ■

ТЭНДЭНЦЫІ

Алега Волчака абвінавачваюць у злосным хуліганстве

Рыгор БУЯН

Супраць кіраўніка праваабарончай арганізацыі «Прававая дапамога насельніцтву» Алега Волчака ўзбуджаная крымінальная справа па артыкуле 201 часткі другой КК «злоснае хуліганства».

Крымінальную справу Маскоўскі РАУС Мінска завёў на былога следчага яшчэ 22 ліпеня, на другі дзень пасля збіцця Алега Волчака супрацоўнікамі тага самага Маскоўскага РАУС. Нагадаем, што 21 ліпеня, пасля завяршэння народных гулянняў у сувязі з завяршэннем прэзідэнцтва Аляксандра Лукашэнкі, каля 21:30 Алега Волчака затрымалі, даставілі ў Маскоўскі РАУС, дзе «оперупаўнаважаны Маскоўскага РАУС Кучук Андрэй адвёў мяне з прымяненнем сілы з двума супрацоўнікамі ў свой кабінет, дзе яны сталі збіваць мяне рукамі і нагамі». Менавіта так Алег Волчак апісвае падзеі вечара 21 ліпеня ў скарзе на неправамерныя дзеянні міліцыянтаў з Маскоўскага РАУС, накіраванай пракурору раёна Н.Лайтэру. Да скаргі пацярпелы прыклаў медыцынскае сведчанне аб зняты пабояў. Цяпер, па словах былога следчага, менавіта яго абвінавачваюць у тым, што ён біў нагамі ў жывот оперупаўнаважанага Андрэя Кучука, які тым вечарам «працаваў» у цывільным адзенні. Менавіта таму ў адносінах да А.Волчака ўзбуджаная крымінальная справа па злосным хуліганстве, а не па артыкуле 187 КК — супраціўленне супрацоўнікам міліцыі.

Па інфармацыі А.Волчака, расследаваннем справы займаецца Маскоўская раённая пракуратура сталіцы. Актыўная грамадская дзейнасць па расследаванні абставінаў знікнення экс-міністра ўнутраных справаў Юрыя Захаранкі, трагедыі на Нямізе і юрыдычная дапамога бацькам дзяцей, якія 30 траўня загінулі на Нямізе, на думку А.Волчака, толькі падаграе цікавасць «органаў» да яго асобы. ■

SOS!

Копыльская трагедия как напоминание

Валерий ЩУКИН, правозащитник

В деревне Бояры Мядельского района закрыли начальную школу. 18 малолеток будут теперь учиться в райцентре.

Причина закрытия — стремление вертикали сэкономить на тепле: в закрытой школе автономное отопление от электрического котла. Родители просили установить в здании хотя бы обыкновенные сельские печи, которые можно топить дровами, но власти отказались удовлетворить даже эту просьбу и с 31 июля 1999 года учителей (а их всего двое) сократили. Причем, без предоставления другого места.

В Мядель школьники добираются проходящим автобусом. В деревне Бояры с 1 сентября в единственный проходящий автобус добавляется 27 ребятишек: 18 — из закрытой начальной школы и 9 ее выпускников четвертого класса. Но рейс этот и так уже переполнен: если не влез в салон или опоздал, то приходится или пропускать занятия, или идти пешком. А это — около шести километров.

Председатель Мядельского райисполкома Иосиф Воронович, правда, пообещал, что будет выделен дополнительный автобус, а учителя трудоустроены. Может быть и так, но только вот учительница ликвидированной школы Людмила Кузьмина на аналогичный вопрос пояснила, что в отделе кадров ей сказали однозначно — рабочего места для нее нет. Да и выделение дополнительного автобуса проблематично, потому что дорого.

Стоит напомнить, что в декабре 1997 года под Копылем в автокатастрофе погибли школьники. Это были только крестьянские дети — чада руководителей в сверхпереполненных автобусах, предназначенных для народа, не ездят. Нет среди школьников и детей местных вертикальщиков. Напомню, что тогда вину вертикали в гибели школьников высшие власти не установили. А ведь начало той трагической истории положило закрытие 8-летней школы в деревне Мяжа и переполненность вследствие этого автобуса, перевозящего школьников. ■

РЭХА

...А у нас свой «силовой» квартал

Уважаемая редакция!

В продолжение темы «Силовой квартал» (№93) обращаем ваше внимание на то, что в том же Партизанском районе есть еще один «силовой квартал» в военном городке Степянка.

Года три назад началось строительство кооперативного кирпичного дома для летчиков. Говорили, что к лету 1998 г. заселят. Сегодня он практически готов. Начали благоустройство и забросили — нет денег, и строители ушли. Когда в нем заживут офицеры — не известно.

Лет 5 назад началось строительство панельного дома. Сегодня рядом с незавершенным 8-м этажем, кроме крана, нет никого. Уже год на уровне 4-го этажа остановлено строительство ещё одного корпуса кооперативного дома.

Но на этом чудеса не кончаются. В то время, как на завершение этих домов для военнослужащих нет средств и они потиху растаскиваются, по зиме начато строительство еще одного большого кирпичного дома. На него средства есть, и он пока строится.

Приезжайте сами (автобус №95, строящийся квартал за домом офицеров и лётной столовой). Возможно, вам удастся разгадать смысл уникального строительного эксперимента.

Жители в/г Степянка

ГРАМАДСТВА

Адкрыўся новы аўтавакзал

БелаПАН

У Мінску, непадалёк ад станцыі метро «Усход», адбылося ўрачыстае адкрыццё аўтавакзала «Маскоўскі». Гэты аб'ект лічыўся даўгабудам: як паведамілі ў Мінгарвыканкаме, яго будаўніцтва вялося 10 гадоў.

Новы аўтавакзал прызначаны для ажыццяўлення міжнародных і міжгародніх перавозак на Маскоўскім і Віцебскім накірунках.

Міжнародныя рэйсы спачатку будуць ажыццяўляцца толькі ў расійскія гарады — Маскву, Санкт-Пецярбург, Чэлябінск і Іванава. Вядзецца работа па арганізацыі паездак у Латвію і Эстонію. Што да міжгародніх маршрутаў, то пунктамі прызначэння станнуць такія гарады Віцебскай вобласці, як Полацк, Браслаў, Бешанковічы, Лепель, Міёры, а таксама сам Віцебск. Арганізаваны рэйс у Нацыянальны аэрапорт «Мінск».

Аўтавакзал «Маскоўскі» спецыялісты называюць адным з буйнейшых у Еўропе: кожную гадзіну адсюль могуць адпраўляцца звыш за 15 тысяч пасажыраў па 60-ці рэйсах; будынак вакзала разлічаны на 600 чалавек. ■

ЛІТВА

Паўночная суседка

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Нішто гэтак радыкальна не раскрывае вочы на сітуацыю ў сваёй краіне, як параўнанне яе з суседзямі па еўрапейскім доме. Дзесяць гадоў таму нашыя журналісты адкрылі для сябе Захад і ў захапленні пачалі пісаць пра тое, што ў іх не так, як у нас. У той час нашае жыццё часцей за ўсё параўноўвалі з парадкамі ў Нямеччыне ці Англіі. Яшчэ праз пяць гадоў стала больш модным рабіць паралелі з Польшчай ці Чэхіяй, якія былі побач, стартавалі ў рэформах прыкладна з тых жа пазіцыяў і давалі шмат станоўчых, але не менш і адмоўных фактаў, на якіх з задавальненнем спекулявалі нашыя левыя. Але і той час прайшоў, і сёння параўноўваць Беларусь з той жа Польшчай — усё роўна як параўноўваць «Запарожац» з «Паланэзам». Шкада часу. Як кажуць, будзе больш канструктыўна, калі за параўнаннямі мы звернемся на поўнач, да нашых бліжэйшых суседзяў — літоўцаў. Як жыве Літва зараз? Вось якія адказы на гэтае пытанне здабыў наш карэспандэнт падчас наведвання гэтай краіны ў жніўні.



Грошы

Вось ужо тры гады курс літоўскай валюты трымаецца на ўзроўні чатыры літы за долар, што робіць яе прывабным сродкам інвестыцыяў і аб'ектам накапленняў. Літовец не ламае галаву над тым, як хутчэй памяняць свой заробак на зялёныя, каб хоць нешта ўратаваць ад інфляцыі. У Літве афіцыйна абвешчаная дэфляцыя — адваротны працэс, калі грошы даражэюць, а прадукты таннеюць і адпаведна расце ўзровень жыцця. «Ён сапраўды расце», — пагаджаўся літоўскі бізнесмен Генрыкас, з якім пазнаёміліся ў Паланзе, і тлумачыў, у чым своеасаблівасць гэтага павышэння. Згодна з Генрыкасам, шэраговы літовец, ведаючы пра тое, што заўтра маладая бульба будзе дзешавей, адкладае візіт у краму на заўтра. Бульба сапраўды таннее, але ў выніку ён і паядаюць менш. Прыкладна тое ж самае з усімі таварамі. Так, яны зараз даступней, чым год таму, але ў параўнанні з былым часам спажываюць іх значна менш. І ўсё ж мой субяседнік ні на хвіліну не сумняваецца, што, выходзячы з СССР, Літва не толькі дамагалася палітычнай незалежнасці, але думала і пра тое, як вярнуцца ў сям'ю багатых еўрапейскіх краінаў. «У расійскім бардаку нашаму чалавеку трывала забраляць грошы немагчыма — мы людзі іншай культуры. Для нас мае значэнне не толькі заробак, але і самапавага, тое, ці чэсна зароблены грошы». Дарэчы, на чым канкрэтна Генрыкас зарабляе, ён так і не сказаў. Круціцца недзе ў камп'ютэрных сетках. Па бізнесацкіх справах часам бывае і ў Беларусі, але ў нас, паводле ягоных словаў, заразь «балота». Толькі, відаць, і на гэтым балоце ўдаецца накасіць «капусты». «Праз вас тэлефанная сувязь з Расіяй непараўнальна дзешавей, вось дзе Кландайк для знаходлівых людзей», — падміргнуў Генрыкас.

Кошты

На асноўныя прадукты кошты ў паўтара-два разы вышэйшыя, чым у нас. Прыкладам, вэнджаная каўбаса, якая ў нас каштуе паўтара мільёна за кілаграм, у Літве пацягне на два з паловай мільёна. Дзешавей чым за палову літа не купіш булачку, у нас столькі каштуе батон, аднак не параўнаць якасць цеста — у нас яно ўжо нават у здобных булках шэрае, а літоўскія батоны ўнутры, як снег. Працэнтаў на 80 даражэй літоўскае малако, масла, сыр, йогурты, аднак які вялікі асартымент і якая якасць. Плюс цуды дробнай расфасоўкі. З дапамогай гэтых цудаў «жыццяздольнасць» прадуктаў павялічваецца ледзь не ўдвая, а спажываецца колькасць памяншаецца. Калі хлеб купляюць ужо нарэзанымі кавалкамі і ў пакецiку, ён менш чарсцвее. «Запячатаныя» такім спосабам сасіскі пратрымаюцца не менш, а нашыя, як вядома, ужо на трэці дзень сохнуць нават у халадзільніку. І самае дзіўнае, няма ў гэтым вопыце нічога сенсацыйнага, літоўцы тут не першапраходцы, а ў нас чамусьці ён не прыжываецца. У чым справа? Можа, у тым, што ў іх не засталося дзяржаўных крамаў, а ў нас, наадварот, ужо амаль не засталося прыватных?

Заробкі

Размова пра кошты бессэнсоўная без размовы пра заробкі. Якія яны ў літоўцаў? Афіцыйныя дадзеныя — сярэдні штомесячны заробак нядаўна падняўся вышэй за планку ў дзвесце долараў, але і тут ёсць разыходжанні. Былы прэм'ер Казіміра Прунскене сцвярджала на расійскім тэлебачанні, што ў Літве сярэдні заробак ужо 250 долараў. Літоўцы, з якімі размаўляў на гэтую тэму, казалі, што іхняя «Тэтчэр» перабольшвае. Максімум — 180–200. З іх трэцяя частка ідзе на аплату кватэры, такім чынам, шыкаваць асабліва няма на што. Сем'і з дзецьмі шмат грошай трацяць на адукацыю сваіх нашчадкаў, падручнікі ў звычайнай школе платныя, утрыманне студэнта патрабуе яшчэ больших грошай. Тым не менш конкурс у ВНУ ў гэтым годзе быў проста шалёны — па дзесяць і больш чалавек на месца. Літоўцы тлумачаць гэтую з'яву не толькі прэстыжнасцю дыпломаў, але і тым, што працаўладкавацца для былых школьнікаў зараз суперцяжка. Няхай лепш вучацца.

Аднак знешне літоўская моладзь не здаецца выкінутай на абочыну жыцця, хутчэй наадварот. Шмат маладых з сотавымі тэлефонамі, карыстанне якімі не выклікае здзіўлення ў атачэння. Малады афіцыянт Робертас кажа, што асабіста ў яго хапае магчымасцяў, каб зарабіць. У рэстаранне плацяць крыху больш за мінімалку, таму восенню ён паедзе на заробкі ў Амерыку — афіцыянтам на круізным цеплаходзе. Дзесяць месяцаў працы — 20 тысяч «зялёных». Мову ён ведае, кантракт падпіша пры дапамозе вярбовачнай фірмы, якіх шмат у Літве. А мінімальны заробак — 500 літаў, гэта значыць 125 долараў ЗША — яго ўжо не задавальняе.

Дзяржава

У нашым уяўленні дзяржава пачынаецца з прэзідэнта. Літоўцы таксама аддаюць свайму прэзідэнту сп. Адамкусу належнае месца. Але адчуваецца, што ён для іх толькі галоўны сярод чыноўнікаў, а не ўвасабленне ўсёй сістэмы. Пра Адамкуса выказваюцца добра тыя, каму за гэтыя два гады стала жыць лепш. Ён падабаецца хатнім гаспадыням, моладзі, якая марыць зрабіць падобную кар'еру — з сярэдняга амерыканскага чыноўніка да прэзідэнта Літвы. Бізнесмены з задавальненнем кажуць пра тое, што пры Адамкусе ў тры разы павялічылася колькасць замежных інвестыцыяў у эканоміку краіны. Але сярод людзей, якія не могуць знайсці працу і збяднелі, ён, вядома ж, не такі папулярны. І ўсё ж нават простыя людзі адзначаюць, што прэзідэнт рэзідэнцыяў не будуе, асабістую ахову не павялічвае, ягоныя перасоўванні па сталіцы жыццё горада не паралізуюць, дзейнасць прэзідэнта бачная, але ён не вылучае сябе на фоне іншых дзяржаўных мужоў. Гэта ацэнена насельніцтвам.

Між тым, кіраўніцтву краіны даводзіцца рабіць і непапулярныя сярод чынавенства крокі. Прыкладам, нядаўна было абвешчана пра скарачэнне ў мэтах эканоміі бюджэту заробкаў дзяржаўных служачых, у тым ліку настаўнікаў і медыцынскіх работнікаў. Прайшла інтэнсіўная дыскусія, якім павінна быць гэтае скарачэнне, і ў выніку вырашылі сэканоміць перш за ўсё на супрацоўніках судоў і пракуратуры, а заробкі настаўнікаў і дактароў урэзаць чыста сімвалічна — на пару працэнтаў. Знаёмая настаўніца англійскай мовы ў рускамоўнай школе Вільнюса не хавае свайго задавальнення. Яна атрымоўвае прыкладна 300 долараў штомесяц і пры гэтым не лічыць, што яе праца аплачваецца, як яна заслугоўвае. У тым, што ў Мінску яе калегі атрымоўваюць за тую ж працу 30 долараў, знаёмая сумняваецца. Для яе, выпускніцы мінскага ін'яза, Беларусь засталася краем, калі не зусім багатым, дык сытым, і ў тое, што ў нас у правінцыі масла даюць па картках, яна проста не верыць.

Рускамоўныя

Рускамоўная знаёмая ўзгадала два эпізоды, якія ілюструюць адносіны карэнных жыхароў і рускамоўных. Першы тычыцца падзеяў сямігадовай даўнасці, калі «ўсе сталі крэйзі на пытанні мовы». Яна села ў таксі і па-літоўску з рускім акцэнтам замовіла дарогу. Таксіст адказаў на падобным дыялекце, хоць побач з ім ляжалі рускамоўныя газеты і было зразумела, хто ён. Так яны ўсю дарогу «прыкідваліся літоўцамі». Зараз гэта падаецца жанчыне дзікунствам, ва ўсякім разе, з рускамоўнымі яна больш не размаўляе па-літоўску і рада, што мінулі часы, калі людзі рабілі з гэтага праблему. Другі эпізод — нядаўні. У іх школу, якая называецца «Згода», прыязджаў сам прэзідэнт Адамкус. Ён вітаў назву школы і ўзгадаў, што гэтак жа ў Штатах называлася літоўскае таварыства. Сэнс прамовы прэзідэнта вельмі спадабаўся рускамоўным настаўнікам — што трэба захоўваць сваю культурную асаблівасць, застаючыся ў згодзе з усім грамадствам. Літоўскую мову вучні гэтай школы вывучаюць з больш шай упартасцю, чым англійскую, бо ў Літве ўсе ВНУ літоўскамоўныя, а паступаць збіраецца ледзь не кожны выпускнік школы. Для новага пакалення літоўцаў проста не стаіць пытання, лічыць ці не сябе грамадзянінам гэтай краіны, з Захадам ці Усходам звязваць свой лёс. Па большасці стандартаў жыцця Літва ўжо ў Еўропе, і для моладзі не існуе іншага выбару. ■

© НАВІНЫ. Спасылка на газету НАВІНЫ абавязковая. Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў, публікаваць артыкулы дзеля палемікі. Адрас: г.Мінск, пр-т газеты «Известия», 8-173. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 996
Выдаецца з 16 студзеня 1998 г. В.а. галоўнага рэдактара і заснавальнік Павел Жук. Выдавец — рэдакцыя газеты НАВІНЫ. Адрас для карэспандэнцыі: 220034, г. Мінск, вул. З.Бядулі, 6-47. Тэл./факс: 236-89-40.
E-mail: NPSvaboda@irex.minsk.by Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) Заказ 589 Нумар падпісаны ў друк 24/08/99 (15:00) Наклад — 16.660